Рэспубліка

23.09.2019

# В Бресте представят факсимильную копию Радзивиловской Библии

## Гартаючы залатыя старонкі

Павел Лосич

**Заўтра ў Брэсце прадставяць факсімільную копію Радзівілаўскай Біблii, аднаго з найбольш значных выданняў у гісторыі айчыннага кнігадрукавання. Фаліянт убачыў свет у 1563 годзе ў першай на тэрыторыі сучаснай Беларусі тыпаграфіі, якую ў Берасці заснаваў Мікалай Радзівіл Чорны.**



Прэзентацыя Біблii адбудзецца сёння ў Брэсцкай гарадской бібліятэцы ў 17 гадзін.

— *Брэсцкая Біблія — самае аб’ёмнае друкаванае выданне XVI—XVIII стагоддзяў у Вялікім Княстве Літоўскім, шэдэўр паліграфічнага мастацтва эпохі Рэнесансу,* — расказвае **кіраўнік аддзела Брэсцкай абласной бібліятэкі Ала Кузьміна**. — *На выданне Біблii Мікалай Радзівіл выдаткаваў свой гадавы даход — 10 тысяч дукатаў. Афармленне было зроблена на вышэйшым узроўні.*

У свеце захавалася каля 130 асобнікаў выдання. Поўных — яшчэ менш. Кошт кожнага арыгінала, па розных ацэнках, складае ад 40 да 140 тысяч долараў. Але справа нават не ў цане: за апошнія паўстагоддзя фаліянт толькі некалькі разоў выстаўляўся на аўкцыёнах.

Доўгачаканы падарунак зрабіў Прэзідэнт. Падчас святкавання 1000-годдзя Брэста Аляксандр Лукашэнка перадаў Музею гісторыі горада арыгінальнае выданне

Радзівілаўскай Бібліі. Яго камплектнасць — 99 працэнтаў. Нейкім цудам захаваліся нават два гравіраваныя тытульныя лісты да Старога і Новага Запаветаў. Падобныя асобнікі існуюць, але іх можна пералічыць па пальцах.

Арыгінал Бібліі — музейны экспанат. Аднак кампанія «Белнафтастрах» і Нацыянальная бібліятэка зрабілі фаліянт даступным для кожнага. Сумеснымі намаганнямі былі выдадзены 11 асобнікаў факсімільнай копіі Берасцейскай Бібліі. Адзін застаўся ў сталіцы, астатнія перадалі Брэсту.

**Намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Алесь Суша** ўпэўнены, што выданне ўвойдзе ў гісторыю сучаснай беларускай культуры:

— *Гэтая кніга ўнікальная сама па сабе. Брэсцкая Біблія стала легендай, яна лічыцца самай прыгожай, дарагой, вялікай і, як яе часам называюць, самай загадкавай у гісторыі кніжнай культуры Беларусі. Сучаснае факсімільнае выданне можна ў пэўнай ступені назваць самым незвычайным у гісторыі айчыннага друку. Ні па памеры, ні па вазе, ні па аб'ёме такіх кніг у Беларусі не выходзіла.*

Кнігу надрукавалі, узнавіўшы з абсалютнай дакладнасцю ўсе асаблівасці арыгінала.